**НОВІКАЎ С. Я.,**
**кандыдат гістарычных навук,**
**дацэнт**



**Рэцэнзент ТУГАЙ У. В.,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

# Прамысловая вытворчасць на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941—1944): спроба кампаратыўнага аналізу айчыннай і германскай гістарыяграфіі

У навуковых працах беларускіх і германскіх гісторыкаў існуюць розныя падыходы да эканамічнай палітыкі Трэцяга рэйху на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады другой сусветнай вайны. Асабліва кантраснымі з'яўляюцца, *па-першае,* колькасныя і якасныя характарыстыкі канкрэтных гістарычных фактаў; *па-другое,* метадалагічныя падыходы пры аналізе вузлавых падзей і працэсаў; *па-трэцяе,* канцэптуальныя ацэнкі праблем акупацыйнай палітыкі і інш. У рамках данага артыкула аўтар спыняецца толькі на двух момантах: спрабуе параўнаць вынікі навуковага вывучэння стану вытворчага патэнцыялу Беларусі ў гады нямецкай акупацыі і суаднесці асобныя метадалагічныя падыходы да эканамічнай палітыкі ў сучаснай беларускай і германскай гістарыяграфіі.

Так, палітыка і практыка нямецкага акупацыйнага рэжыму ў галіне вытворчасці знайшла сваё навуковае адлюстраванне ў асобных гістарычна-эканамічных працах айчынных [1] і замежных [2] даследчыкаў.

Паводле аднаго з найноўшых беларускіх выданняў «у гады вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічала каля 60 адносна буйных прадпрыемстваў (з колькасцю рабочых больш 30)» [3]. У другой гістарычна-эканамічнай працы знаёмімся з падлікамі, з якіх вынікае, што «в 1942 г. в Белоруссии действовало *свыше* (выдзелена мной. — **С. Н.**) 60 предприятий» [4]. Трэцяя калектыўная работа ўвогуле абмінае агульную лічбу прадпрыемстваў, хаця ў ёй намаганні некалькіх аўтараў скіраваны на даследаванне спецыяльнага пытання — «Экономика Белоруссии в годы Великой Отечественной войны» [5]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што нават пры адсутнасці канкрэтных колькасных характарыстык, без уліку максімальнай паўнаты гістарычных фактаў і іх крытычнага аналізу ў айчынных працах прыведзены вывады ў дачыненні да стану прамысловай вытворчасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Больш таго, чытача пераконваюць у тым, што «ў рабоце прамысловых прадпрыемстваў Беларусі ў гады акупацыі

праяўлялася іншая тэндэнцыя — паступовае скарачэнне колькасці дзеючых прадпрыемстваў і аб'ёмаў вытворчасці [6].

Нямецкія навукоўцы прыводзяць сваю геаграфію прамысловай вытворчасці ў акупаванай Беларусі, дзе на пастаянным (штомесячным, паўмесячным, тыднёвым) уліку розных акупацыйных устаноў, інспекцый, каманд, аддзелаў ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі былі як буйныя, так і дробныя прадпрыемствы, якія забяспечвалі выкананне шэрагу ваенна-эканамічных праграм, планаў, заданняў Трэцяга рэйху. Так, з навуковай працы германскага даследчыка К. Герлаха вынікае, што на пачатак 1943 года ў генеральнай акрузе Беларусь было ад 100 да 300 цэнзавых прадпрыемстваў, на якіх працавалі ад 7 да 12 тыс. чалавек [7]. У дачыненні да гэтай жа тэрыторыі, дзе гаспадарчыя задачы разам з эканамічнымі аддзеламі генеральнага і акружных камісарыятаў вырашала і эканамічная інспекцыя «Цэнтр», у выданні другога гісторыка Р.-Д. Мюлера сустракаем такія даныя (адлюстраваныя ў заключнай справаздачы эканамічнага штаба Ост аб дзейнасці на занятых усходніх тэрыторыях): у генеральнай акрузе Беларусь на пачатак 1943 г. было 173 прадпрыемствы з агульнай колькасцю 8618 рабочых [8]. Увогуле прамысловай вытворчасцю ў межах дзейнасці эканамічнай інспекцыі «Цэнтр» (тэрытарыяльна яна займала палову Беларусі) было ахоплена ад 40 да 60 тыс. рабочых, якія былі заняты на 500—700 прадпрыемствах [9]. Пры гэтым гістарычныя крыніцы даюць нямецкім даследчыкам падставы прыйсці да абгрунтаваных высноў аб пашырэнні тэхнічнай базы прамысловай вытворчасці ў Беларусі шляхам вывазу і выкарыстання абсталявання з занятых расійскіх і ўкраінскіх абласцей [10].

Такім чынам, у беларускага чытача з'явіліся факты для самастойнага аналізу супярэчлівых статыстычных даных аб прамысловай вытворчасці, яе стане на акупаванай тэрыторыі Беларусі з лета 1941 па лета 1943 г. [11]. Але ў айчыннай гістарыяграфіі дагэтуль не напісана цэльная карціна прамысловасці, яе галін, прадпрыемстваў, на якіх у гады другой сусветнай вайны былі вымушаны працаваць беларускія людзі. У некаторай ступені сітуацыя праясняецца, калі звярнуцца да архіўных крыніц, якія раней былі альбо недаступнымі для даследчыкаў, альбо проста не выкарыстанымі [12].

Нашы падлікі, праведзеныя на аснове знойдзеных на сённяшні дзень дакументаў (аўтар не лічыць іх канчатковымі. — **С. Н.**) з айчынных і замежных архіваў, тым не менш, могуць быць асновай: *па-першае,* для выяўлення агульнай колькасці і геаграфіі прамысловых прадпрыемстваў; *па-другое,* вызначэння тэндэнцый іх развіцця ці заняпаду; *па-трэцяе,* ацэнкі працоўнага патэнцыялу Беларусі ў гады акупацыі (трэба ўлічваць, што ад 3/4 да 9/10 усяго насельніцтва было занята ў галіне сельскай гаспадаркі [13]).

Спачатку возьмем у якасці прыкладу тэрыторыю, якая знаходзілася ў межах дзейнасці ваеннай адміністрацыі тылавога раёна групы армій і эканамічнай інспекцыі «Цэнтр». Паводле статыстычных даных эканамічных каманд (Бабруйска, Барысава, Віцебска, Гомеля, Клімавіч, Лепеля, Магілёва Оршы, Полацка) па стане на 31.08.42 г. на іх тэрыторыі знаходзілася 426 прадпрыемстваў з агульнай колькасцю занятых — 40 068 чалавек [14]. Менш чым праз год (на 1.05.43 г.) агульная лічба прадпрыемстваў павялічылася да 513, прычым сярод

іх з колькасцю рабочых ад 20 да 4000 — 266 прадпрыемстваў: дабываючай, хімічнай, тэкстыльнай і апрацоўваючай прамысловасці; торфанарыхтоўкі і дрэваперапрацоўкі; вытворчасці шкляных і керамічных вырабаў; энергазабеспячэння. Усяго на гэтых вытворчасцях было занята звыш 47 000 чалавек [15].

Разгляд самой структуры вытворчасці і занятых на ёй у межах усёй тэрыторыі эканамічнай інспекцыі «Цэнтр» дае нагляднае ўяўленне і аб суадносінах з іншымі рэгіёнамі Расіі, да таго часу захопленымі нямецкімі войскамі. Так, на пачатак верасня 1942 г. самая вялікая колькасць прадпрыемстваў знаходзілася на тэрыторыі эканамічнай каманды Бабруйска (173 ці 32,3 % ад агульнай колькасці). Занятых на іх было яшчэ больш (42,3 %). Увогуле ў тылавым раёне групы армій «Цэнтр» асаблівую ролю адыгрывалі на той час эканамічныя каманды Віцебска, Оршы і Бабруйска, на тэрыторыі якіх знаходзілася 8/10 усіх прадпрыемстваў і звыш 9/10 усіх занятых [16].

Такім чынам, можна падвесці папярэднія вынікі. Асновай для іх з'яўляецца праведзены вышэй на падставе дакументальных крыніц і найноўшай гістарычнай літаратуры крытычны аналіз агульнай колькасці прадпрыемстваў, што знаходзіліся на *ўсёй* (выдзелена мной. — **С. Н.**) тэрыторыі акупаванай Беларусі, на якой, па нашых падліках, на канец 1942 г. было 812 буйных і дробных прамысловых вытворчасцей з колькасцю занятых на іх амаль у 150 тыс. чалавек [17]. У гэтай сувязі перад аўтарам паўстае пытанне, якое датычыцца даклада рэйхскамісара Остланда Лозэ на нарадзе ў Рызе ў кастрычніку 1942 г., калі было заяўлена, што ў генеральнай акрузе Беларусь да ліку *дзеючых* (выдзелена мной. — **С. Н.**) адносяцца 800 (?!) прамысловых прадпрыемстваў [18].

Зараз пазнаёмім чытача з асобнымі фактамі. Напрыклад, паспрабуем, з аднаго боку, выявіць колькасць прадпрыемстваў на тэрыторыі таго ці іншага адміністрацыйнага рэгіёна ці горада Беларусі, а з другога — даць характарыстыку найбольш значных прадпрыемстваў па выкананні абавязковых заданняў для вермахта, ваеннай ці цывільнай адміністрацыі, самой нацысцкай Германіі і г. д. Коратка спынімся толькі на адным прыкладзе. Звернемся пры гэтым да айчынных выданняў, у якіх сцвярджаецца, што ў Мінску «ўвосень 1941 г. з 332 існуючых да вайны буйных прадпрыемстваў з 40 тыс. рабочых гітлераўцам удалося запусціць 39, то напярэдадні вызвалення сталіцы іх працавала толькі 19» [19]. Пры гэтым адзначым: цэльныя статыстычныя даныя аб стане прамысловасці ў акупаваным горадзе адсутнічалі дагэтуль, не знайшлі яны свайго адлюстравання нават у новых энцыклапедычных выданнях [19а]. У такім выпадку зазірнем у германскія навуковыя працы. Так, яшчэ ў 1984 г. у Берліне выйшла навуковае даследаванне аб партызанскім руху ў Беларусі, дзе аўтар між іншым спыняўся і на разглядзе індустрыі горада і адзначаў, што «ў пачатку 1943 г. у Мінску працавала 150 прамысловых аб'ектаў з 35 тыс. рабочых» [20]. У найноўшым нямецкім выданні 2000 г. сустракаем: у горадзе на 150 прадпрыемствах была занята амаль 41 тыс. чалавек. Апрача таго, на ўліку статыстычнай службы гарадскога камісарыята знаходзілася яшчэ 180 аб'ектаў гандлю, служб па абслугоўванні вермахта, устаноў гарадскога ўпраўлення [21]. Цікава тое, што нямецкія даследчыкі выкарыстоўваюць для доказаў дакументальныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Беларусі. Размова ідзе аб пратаколе нара-

ды кіраўнікоў генеральнага і акружных камісарыятаў у Мінску 8—10 красавіка 1943 г. [22].

Для некаторых айчынных даследчыкаў, такім чынам, матэрыялы нарады былі па-за межамі навуковых пошукаў. Але ж у матэрыялах адлюстраваны падзеі, прыведзены факты, згаданы аб'екты эканамічнай палітыкі і практыкі цывільнай адміністрацыі ў генеральнай акрузе Беларусь. Заўважым, два першых дні работы нарады былі прысвечаны разгляду агульнага эканамічнага становішча, удакладненню задач у вобласці прамысловасці і рамяства, выкарыстанні мясцовай рабочай сілы, вядзенні налогавага заканадаўства і фінансавай дзелавой практыкі, дзейнасці бірж працы і інш. [23].

Выкарыстанне такой крыніцы ў якасці аргументаванага доказу, на наш погляд, тым не менш, не азначае, што прыведзеныя матэрыялы не падлягаюць навуковай экспертызе і не існуе метадалагічнай патрэбы спыняцца на падрабязным аналізе прыведзеных фактаў. Паспрабуем пераканацца ў гэтым і таму звяртаем увагу чытача на некалькі дэталяў. Перш за ўсё, для даследчыкаў важна ведаць не толькі агульную лічбу, але і дакладна ўяўляць унутраную структуру прамысловай вытворчасці горада. У гады акупацыі ў ім было: 20 металургічных, 14 тэкстыльных і скураных прадпрыемстваў, 15 вытворчасцей папяровай і друкарскай прадукцыі, 41 — будаўнічая арганізацыя, 21 — транспартная, 6 — дрэваперапрацоўчых, 7 — хіміі і будматэрыялаў, 13 — харчовай прамысловасці, 3 электрастанцыі [24]. Менавіта такі пералік быў прыведзены старшым урадавым інспектарам Маосам — супрацоўнікам гарадской біржы працы на згаданай вышэй нарадзе, дзе перад кіраўнікамі генеральнай акругі Беларусь прагучала канкрэтная лічба ў «150 буйных (так у дакуменце. — **С. Н.**) прадпрыемстваў» [25]. Але наколькі гэта лічба вынікае з пералічаных пагалінова прадпрыемстваў, вытворчасцей і арганізацый. Нават арыфметычны падлік дае суму з іншай лічбай — <u>140 прадпрыемстваў</u> (!) (выдзелена мной. — **С. Н.**), г. зн. на 10 менш, чым прыведзена вышэй. Узнікае лагічнае пытанне, што гэта: недакладнасць нямецкай статыстыкі (!), недагляд старшага інспектара, тэхнічная памылка падчас афармлення пратакола альбо страта прамежкавых статыстычных дакументаў? Пастаўленае пытанне пакуль застаецца адкрытым, паколькі патрабуе асобнага даследавання, праверкі даных, іх удакладненняў і г. д. Таго ж патрабуюць і іншыя лічбы.

Напрыклад, наколькі дакладнымі з'яўляюцца даныя аб занятых на гэтых прадпрыемствах. Як адзначана вышэй, у 1943 г. на іх працавала адпаведна 35 тыс. і 41 тыс. чалавек. Яшчэ раз звернемся да даклада Маоса, якім было асобна падкрэслена, што ў прамысловасці горада «працуе 35 000 чалавек, да гэтага яшчэ 8500 яўрэяў і 3190 ваеннапалонных» [26]. Як бачым, арыфметычны падлік дае нам іншую лічбу — 46 690 чалавек. Але і іх неставала для выканання заданняў на ваенных і цывільных прадпрыемствах Мінска, у якім вясной 1943 г. была патрэба амаль у 6000 спецыялістах і 2—4 тыс. рознарабочых [27].

На заканчэнні доследу коратка спынімся на параўнанні статыстычных даных прамысловай вытворчасці ў акупаваным Мінску. З мэтай выяўлення дынамікі яе развіцця ці заняпаду суаднясем вядомыя нам факты: у кастрычніку 1941 г. у акупаваным горадзе дзейнічала 39 прамысловых вытворчасцей; да

лютага 1942 г. іх колькасць павялічылася амаль удвая і дасягнула 77 прадпрыемстваў; але і гэта лічба практычна падвойваецца да красавіка 1943 г., калі ў Мінску да ўліку падлягалі 150 вытворчасцей. Пры гэтым іх большая частка была буйнымі аб'ектамі [28] з колькасцю занятых ад 30 і нават да 5 тыс. чалавек [28а]. У дачыненні да асобных вытворчасцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі неабходна толькі зазначыць, што менавіта на беларускай зямлі знаходзіліся: «самае буйное прадпрыемства Остланда» [29], «адна з самых буйных вытворчасцей на ўсёй занятай савецкай тэрыторыі» [30], «самае буйное торфаздабываючае прадпрыемства» [31], «буйнейшы дрэваперапрацоўчы камбінат» [32] і інш.

Ці ведаем мы дакладна гэтыя і іншыя прадпрыемствы? Якім чынам было магчыма такое «развіццё» прамысловай вытворчасці на тэрыторыі акупаванай Беларусі? Ці гэта — вынікі мэтанакіраванай эканамічнай палітыкі вышэйшага нацысцкага кіраўніцтва, плён дзейнасці цывільнай і ваеннай адміністрацыі па выкананні «Распараджэнняў аб аднаўленні эканомікі ў генеральнай акрузе «Беларусь» [33], ажыццяўленні «Першага эканамічнага плана для Беларусі» [34], «Татальнай мабілізацыі вытворчасці Беларусі» [35] і інш.? У якім спецыяльным даследаванні, напісаным на аснове наяўнай на сёння архіўнай базы і ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі, можна знайсці адказы на ўзнікшыя пад час нашага знаёмства пытанні?

Такім чынам, праведзены кампаратыўны аналіз дазваляе заключыць: толькі *дакументальныя першакрыніцы* з'яўляюцца надзейным падмуркам навуковага доследу і асновай адказаў на розныя, у тым ліку і супярэчлівыя пытанні эканамічнай палітыкі нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг. Пошук навукова аб'ектыўных адказаў — актуальная задача не столькі замежнай, колькі сучаснай беларускай гістарыяграфіі.

---

1. Эканамічная гісторыя Беларусі. Выд. 3-е, дап. і перапрац. Мн., 1999. С. 326—335; Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3-х т. Т. 1. 1941—1942. Мн., 1983. С. 185—197, 467—477; Т. 3. Мн., 1984. С. 171 — 183; Хозяйство Белоруссии в период немецко-фашистского оккупационного режима. Срыв экономической программы врага // Олехнович Г. И. Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны (1941—1945). Мн., 1982. С. 14—53; Гісторыя Беларускай ССР. У 5-ці т. Т. 4. Мн., 1975. С. 250—263, 344—353; Экономика Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.) // Экономика Советской Белоруссии (1917—1967). Мн., 1967. С. 285—318; Мінск у перыяд Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гады) // Гісторыя Мінска. Мн., 1967. С. 437—467.

2. Gerlach Christian. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 2000. — 1232 S.; Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943 / hrsg. und einleitet von Rolf-Dieter Mueller. Boppard, 1991. 671 S.; Witalij Wilenchik. Die Industrie Weissrusslands waehrend der Okkupation 1941—1944, in: Forschungen zur Osteuropaeischen Geschichte. Bd. 34. Berlin, 1984. S. 193—195.

3. Эканамічная гісторыя Беларусі..., С. 329.

4. Олехнович Г. И. Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны..., С. 18.

5. Экономика Белоруссии в годы Великой Отечественной войны..., С. 289—300.

6. Эканамічная гісторыя Беларусі..., С. 329.

7. Gerlach Christian. Kalkulierte Morde..., S. 386. Да таго ж заўважым, што да ліку цэнзавых аддзелы статыстыкі генеральнага камісарыята ў Мінску і эканамічнай інспекцыі «Цэнтр» у Барысаве адносілі прадпрыемствы, на якіх было звыш 20 рабочых.

8. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten..., S. 477.

9. Параўнай: Gerlach Christian. Kalkulierte Morde..., S. 386; Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten..., S. 403 і 477.

10. Gerlach Christian. Kalkulierte Morde..., S. 389.

11. Аўтар вызначае такія храналагічныя рамкі на падставе статыстычнага ўліку эканамічнай інспекцыі «Цэнтр», дзейнасць якой на тэрыторыі эканамічных каманд Магілёва, Оршы і Гомеля з восені 1943 г. была падпарадкавана задачы спынення вытворчасці, яе дэмантажу і вывазу абсталявання ў сувязі наступленнем савецкіх войскаў.

12. Напрыклад: Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 978. Аўтар зыходзіць з таго, што для айчынных даследчыкаў былі вядомы матэрыялы нарады, якая праходзіла ў Мінску 8—10 красавіка 1943 г. з удзелам акружных камісараў, кіраўнікоў галоўных аддзелаў і аддзелаў генеральнага камісара. Аднак чаму гэтыя матэрыялы ў поўным аб'ёме не патрапілі ў айчынныя выданні па гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны — пакуль застаецца для аўтара пытаннем. Гл., напрыклад: Олехнович Г. И. Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны..., С. 167 (сноска 9 — ЦГАОР БССР. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1263. Л. 128); Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3 т. Мн., 1983—1985.

13. НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1262. Л. 45; Федэральны ваенны архіў Германіі (далей ФА-ВА): RW 31/862, Bl. 19.

14. НА РБ. Ф. 412. Воп. 1. Спр. 113. Л. 299 — 301; ФА-ВА. Wi Stab Ost,Stab Abt. I/1d, Br. Nr. 90860/42g v. 21. 04. 42. F (мікрафільм) 42745. Bl. 398 — 418 (падлікі аўтара).

15. НА РБ. Ф. 412. Воп. 1. Спр. 189. Л. 2 — 82 адв.; ФА-ВА. RW 31/262, Berichte Nr. 84546/43, 84525/43g v. 7. 07. 43 (падлікі аўтара).

16. НА РБ. Ф. 412. Воп. 1. Спр. 113. Л. 296 адв.

17. НА РБ. Ф. 412. Воп. 1. Спр. 113. Л. 299—301; Спр. 189. Л. 2—82 адв.; ФА-ВА: RH 3/v. 332. Bericht Aussenstelle 17 der Rü Inspektion Ukraine über in Gang gesetzten Betriebe: Heimische-, Metallverarbeitende,- Holzverarbeitende Industrie, Leder und Textilien, Steine und Erde und verschiedene Betriebe v. 20. 01. 42; Wi Stab Ost, Stab Abt. I/1d, Br. Nr. 90860/42g v. 21. 04. 42. F (мікрафільм) 42745. Bl. 398—418; RW 31/262, Berichte Nr. 84546/43, 84525/43g v. 7. 07. 43 (падлікі аўтара). Пры гэтым неабходна ўлічваць, што аўтар на момант напісання артыкула не выяіў дакументальных матэрыялаў аб дзейнасці аддзела эканомікі генеральнай акругі Житомір, у склад якой уваходзіла амаль 1/10 частка акупаванай тэрыторыі Беларусі.

18. НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 774. Л. 63.

19. У такой форме аўтарам выдзелена агульная думка, якая адлюстравана ў кн.: Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков..., Т. 3. С. 176; Эканамічная гісторыя Беларусі..., С. 329—330; Экономика Советской Белоруссии..., С. 293.

19а. Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 5. Мн., 1999. С. 148—161; Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 29—32, 344—346. Выключэннем з'яўляецца публікацыя Г. Дз. Кнацько ў «Народнай газеце» ад 1.07.93 г.

20. Witalij Wilenchik, in: Forschungen zur Osteuropaeischen Geschichte. Bd. 34. Berlin, 1984. S. 194.

21. Параўнай: Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1262. Л. 97; Народная газета. 1 ліпеня 1993. Gerlach Christian. Kalkulierte Morde..., S. 394.

22. Гл.: НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1263.
23. Гл.: Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1262. Л. 2—7; Спр. 1263. Л. 1 — 6; Ф. 4683. Воп. 1. Спр. 978. Л. 1—6.
24. Параўнай: Кнатько Г. Д. Минск в годы оккупации // Народная газета. 1 ліпеня 1993. № 125—128. С. 12; НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1263. Л. 97.
25. НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1263. Л. 97.
26. Тамсама. Л. 97.
27. Параўнай: Ф. 370. Воп. 1. Спр. 1262. Л. 98; Спр. 1263. Л. 97; Ф. 4693. Воп. 1. Спр. 978. Л. 127; Эканамічная гісторыя Беларусі..., С. 330.
28. НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 818. Л. 1—4; ФА-ВА (BArchP) F 43386, Bl. 564—618 (падлічана аўтарам).
28а. Gerlach Christian. Kalkulierte Morde..., S. 436.
29. Тамсама. S. 436.
30. Тамсама.
31. Тамсама. S. 406.
32. Тамсама. S. 388.
33. НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 777. Л. 1, 2.
34. НА РБ. Ф. 510. Воп. 1. Спр. 65. Л. 84; Ф. 370. Воп. 1. Спр. 35. Л. 45; Спр. 1837. Л. 112.
35. НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 815. Л. 11.